Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

Цана нумару 15 гр.

№ 3. Вільня 25 Красавіка 1934 г. Год I.

АСВА

Рэдакцыя і анміністрацыя
WILNO,
ul. S.S. Miłosierdzia Nr. 18 m. 5.

Прэнумэрата: у год 3 зл.
у поў года 1,50 зл.

ДВУТЫДНЕВІК ГРАМАДЗКАГА ГУМАРУ і САТЫРЫ.

Стаіцё вы голыя, як турэцкія сьвятыя.

Падводзячы вынікі сьвяткаваньня 16 угодкаў Б.Н.Р. „Родны Край“ піша:

„Раніцай адбыліся царкоўна-касьцельныя (санацыйна-хадэцкія .. заў. асв.) урачыстасьці .. Увечары-ж наладжаны былі дзьве акадэміі Т.Б.А. і хадэцыяй“...

Аб хадэках, Антоша Луцкевіч атклікаецца так:

„Хадэцкая акадэмія складалася з рэфэрату кс. Гадлеўскага аб падзеях, якія папярэдзілі, ці былі зьвязаны з актам 25 сакавіка 1918 году. Прамоўца расказаў шмат падробнасьцяў, дагэтуль мала ведамых нашаму грамадзянству“.

Нарэшце, заканчваючы, цешыцца Луцкевічаўская „брація“:

„Публікі хапіла на абедзьве акадэміі... Беларусы паказалі, што яны ў сталіцы Краю ёсьць і ня толькі не слабеюць тут, але крапчэюць“.

Так працоўныя Заходняй Беларусі разам з сваімі братамі, паказалі вас паночкі, зьдзёршы шматгадовую маску і стаіцё вы сёньня, голыя, як турэцкія сьвятыя з усёю сваею беларуска-буржуазнаю цудоўнасьцю. Ад лаянак, адзін на аднаго, пачынаеце пераходзіць да цёплых гутарак:

— Нас толькі двое,
Абое мы рабое,—
Хоць розным быў наш шлях:
Адзін будуем гмах:
На ім дэвіз пагоні
І жыцьця нашы гоні
Вядуць у тую дзьвер,
Дзе зорка — Б.Н.Р.

Работнік і працоўны селянін з вашага сьвята робіць свой вывад:


— Яны кажуць, што на сьвята
Хапіла нашага ім брата,
Што салі поўныя былі
Незалежнасьцю цьвілі
У вас ня была люду працы,
Пір вялі „дварцы“, палацы
Там Астроўскі і Луцкевіч,
Кс. Гадлеўскі і Станкевіч
Праглядалі здрады шлях,
„Дзе з аружжам у руках
Мужна білісь за ідэі“.
Тут сабралісь ліхадзеі,
Чорнай зграі груганы
Беларускія паны.

Зьмітрук Быліна.

№ 2 „АСВА“ СКОНФІСКАВАНЫ.

„Ахвярная культурная праца“.

(Найвялікшай імпрэзай у 1933—34 г. былі г. зв. „беларускія бліны“. Са справаздачы віленскага аддзелу Бел. Інст. Гасп. і Культуры).




Сямейка чыстакроўная
Хадэкаў ўсіх масьцей;
І мэта іх вымоўная.
Нам ведама часьцей
Сабралісь таўстапузыя
На сьвята Ј. Б. К.
Блінцы блінцы, а твары ўсіх
І каркі, як ў быка.
Культурнай працы людзі тут:
Палітыка, то брэд —
Асьветы лёзунг ўсюды пруць,
Як сродак ад ўсіх бед.
Ідэйкі белнародныя,
Паны снуюць снуюць.
Працоўныя - галодныя
Праклёнства—ганьбу шлюць.

Узьняўся крык...

Быў дваццаць пяты сакавік. На акадэмію,— на сьвята сабралісь ўсе паны; прымусам сагнаны хлапчаты, гемназіяльныя дзяўчаты прыпёрлі рой „АСВЫ“. Падняўся раптам крык: „бальшавік!!!... бальшавік!!!“. „АСВА“ тым крыкам неўнімала,— да сэрца проста пхала джала .. Панам зрабіла многа болі; ім не забыць таго ніколі, як ў дзень славуты Б. Н. Р. „АСВА“ ўварвалась проста ў дзьвер.

Асвёнак.



У 193 4 г. паміж Польшчай і Нямеччынай быу падпісаны пакт аб ненападаньні на 10 год і гандлевы дагавор.

Добрае дзіцё.

(З „Мухі").

Бацька. — Чакай, жэўжык, як толькі буду мець вольную хвіліну, зараз табе скуру згарбую.

Сынок. — Не рабі гэтага, татачка, бо я чытаў, што гарбары маюць застрайкаваць і хочуць біць страйкаломаў.

Пы мны кватэрант.

— Ад заўтра буду вінны гаспадару толькі палову залеглых грошай за памешканьне.

— Як-жа вы гэта зрабілі?

— Вось штука. Даведаўся ад яго прыслугі, якую ён мае вышыню і шырыню, нешта зрабіў паводле меркі і заўтра пашлю да яго памешканьня.

— Дык вы хіба-ж кравец?

— Не. Я майстар на фабрыцы мэталёвых трумен.

Дзякаваць богу.

Доўгі час ня бачыліся два прыяцелі, спаткаўшыся пусьціліся ў гутарку.

— Ну, як вы жывяцё?

— Нічога сабе патроху..

— А з працаю як?

— Вельмі добра, — зарабляем, дзякаваць богу, ня дрэнна..

— Дзе.. як, у каго?!

— Вельмі проста, за тое, што возьмеш у пана, дзяржавы палена дроў, нас штрафуюць на 100 і 200 зл., за якія мы адсіжваем па 5 — 10 дзён, — вось і абыходзіцца дзень 20 зл., ці-ж гэта дрэнна?!

Пчала.

Панскія развsituacji жаньні.

Пішучы аб голадзе, Антон Луцкевіч кажа:

„Усё гэта вынікі таго, што не дадзена хлебаробу нашаму неабходнае агранамічнае веды".

Пан Станіслаў Сімановіч у часопісу „Влучэнга" прычыны галоду бачыць у атмасфэрычных зьявах і шматгадовай акупацыі (?!) рускага царызму?!

Селянін адчувае усё на сваёй скуры і коса дзівіцца, як на аднаго, так і на другога.

Працоўны.

Жытуха.

З газэт, гэта значыць, мы даведаліся, што ў гэтым годзе у СССР будзе утворана 1300 новых пунктаў электра-энэргіі. Электрафікуюцца 102 машына-трактарных станцыі і 159 калгасных ферм.

А ў Корсунскім раёне (Кіяўскай вобласьці— Совецкая Украіна) да 1 траўня заканчваецца гідростанцыя, каторая дасьць энэргію тром суседнім раёнам.

У калгасах будуць электрыфікаваны ўсе працэсы вытворчасьці: малацьба, даеньне кароў, прыгатаваньне корму, забясьпячэньне вадою награваньне памешканьня і паліўка палёў.

Вось, як там закелзваюць гэтую самую, прыроду і кажуць: рабі, братку, за нас, нечага табе дурака валяць, у хаванага з ветрам гуляць. Лезь пад карову, бяры ў рот цыцку і гані сюды малако.. малаці хлеб... сікай на полі дажджом..... На Ільлю няма чаго надзеяцца, яго пара адышла.. Ня хочаш?! не падпарадкуешся?! У нас брат жарты дрэнныя, а то і на луну дарогі мерыць пашлем..

Вось, якія справы закелзаюць гэта значыць, прыроду, а самы рукі ў кішэні прагульваюцца ды штэпсалі пакручваюць, а там электрыка, — дзікая сіла да гэтуль будзе рабіць сваю справу...

Жытуха, брат, як у казцы...

Кастрыца.

ЯПОНСКІЯ ІМПЭР'ЯЛІСТЫ Ў МАНДЖУРЫІ.



І калі сьвіное рыла
Суне хто ў Совецкі край,
Ен дастане без мярыла —
Пойдзе жыць адразу ў рай.



Есць Пешчанікі мястэчка
Ад Беластока недалечка;
Дзе жыве Язэпка Грэсь;
Знаець люд яго увесь.
Той Язэп, што старшынёю
Быў Управы Акружной;
У верх з паднятай галавою
Насіў нос задерты свой.
Што ня раз трос кулакамі
На Галоўную Управу;
Сёньня горлам і бакамі
Робіць вось якую справу.
Накруцілі яму гайку, —
З Грэся робяць, проста лайку,
Што крычыць, галосіць брэды —
„Праз культуру зьнішчым беды“.
Пасудзеце-ж працы людзі
Каму карысьць ад Грэся будзе;
Каму робіць Язэп ласку, —
Што галосіць, зьняўшы маску.

Тэбэшонак

Рагочуць лічбы.

У БССР, як падаюць газэты лічба школ у 1933 г. дайшла да 8546 (ў 1931 г было 6507). У школах вучыцца **1 148.000** дзяцей (96 прац. усяе лічбы дзяцей у Сов Беларусі).

У **1933** г. існавала **19** вышэйшых школ **83** тэхнічныя школы, **35** рабфакаў (работніцкіх факультэтаў). **27** навукова - дасьледчых устаноў на чале з Беларускай Акадэміяй Навук.

Тэатраў ёсьць **11**, штодзенных газэт — **11**, якія друкуюцца у ліку **297.500** экз. Рэгулярных часопісаў выходзіць **75** у колькасьці **298.000** экз.

Нацдэмы - ж чхаюцца й плююцца
— Культура зьнішчана —; прымус,
Радкі тут лічбамі сьмяюцца,
А ў іх працоўны беларус.

З. Б—на.

Дзербанулі...

Да чаго гэтыя санатары хадэкі ды іншыя іх саратнікі сталі нахабныя — самы праўду хаваюць, а робяць від што за праўду гарой.. Апошнімі часамі раззлаваны што засталі злапаны на гарачым учынку разам з сваімі калегамі Дварчанінам, Ракам, Мятлой і Бурсэвічам накінуліся, як галодныя воўкі на рэформу беларускага правапісу там у БССР, паднялі - такі гармідар, што здаецца ад гэтае Совецкае Беларусі, у Советах нічога не засталося апрача пустога месца „Мову зьнішчылі“, „культуру зьнішчылі“; „вучоных людзей на Салаўкі павысылалі“; маскалёў усюды панасадзілі“, — крычаць яны на ўсіх скрыжаваньнях.. Крычаць і робяць від сапраўдных абаронцаў, не інакш як толькі усяго „суцэльнага і непадзельнага“, беларускага народу.

Дык якую-ж гэта мову нішчыць новы правапіс? Аб гэтым маўчаць. Хітруны, ведаюць добра, калі пачнем баўбатаць, уступаць у дробязі, то яшчэ можна заблытацца і выбаўтаць сябе з галавою. Але-ж перад „Асвой“ і мільёнамі ой на порлівых „асьвят“, усё роўна не схавацца. Мы ўжо даведаліся, што гэтыя „татачкі“ і „мамачкі“ бароняць сваю санацыйна — хадэцка — нац дэмаўскую мову, культуру і сваіх „вучоных“ людзей.

Вось, каб не быць галаслоўным, прыточваем „мастацкі твор“, напісаны выдатным беларускім пісьменнікам Лыньковым паводле нацдэмаўскіх рэцэптаў — слаўнікоў.

Ціха грукацела брыка.

Кандрат ехаў да хаты выдлыж бліжняга поля, якое пасьцілалася блехам.

Быў кіжыль. Абванзоплены конь зусім аба мрэў, амбарасна ківаў галавой, матляў засохлывымі вушмі. Але, заўважыўшы даражэнь, ён аптэсам, аб адным якім камленьні кінуўся за вароты і ўкульміўся ля возу з сенам.

Кандрат пайшоў у хату.

— Палі сьвятло, — кінуў ён з парогу да жонкі, скінуўшы генчыкі на лаву, на якой стаялі каўбыры да казанкі з бубурамі.

Жонка доўга поркалася ля гцынцалю, усё не магла знайсьці сярнічак.

— Ды што ты гнюпаіш там?

— Адвяжыся ты, анцуюд, не даеш мне аталёку. Сам вось, апікулат такі, схаваў мусіць сярнічкі ў шопу—няма ніводнай.

— Ну, гэта браце абэлка.

— Абэлка не абэлка, а атумэка поўны...

Урэшце жонка запаліла сьвятло.

— Ну, дык не блакуняйся ты па хаце, ды дай мне есьці. Трэба ж дукрыць урэшце..

Яна павярнулася да яго, у колычах, высокіх барлёгах і палапленым дрыліху, з непавязаным завыкам.

— Кінь ты жміндзіць, толькі-ж сьнедаў, здаецца, бонда гэткая.. Вазьмі хіба дзярбонікі ў печы.

— Якія-ж тут дзярбонікі, калі, можна сказаць тут адны ахараткі засталіся.

Хопіць.. хопіць, аж надта можа абураўшыся, крыкнець нам чытач, змучаны: „блехамі“, каўбырамі“, „абэлкамі“, „дзербонікамі“ і усімі нацдэмаўскімі „ахраткамі“. Але ж. што ты значыш чытач, мільённы асьвіны рой, для іх нацдэмаў? Яны бароняць такую мову. называюць яе культурнаю, а людзей якія працавалі на гэтым сьметніку „вучонымі“. Дык рэформа беларускага правапісу так іх усіх „дзербанула“, што паляцелі „блехі“ „ахраткі“, „дзербонікі“ разам з сваімі „вучонымі“. Яна зруйнавала, штучна пабудованыя, муры паміж мовамі: беларускаю і расейскаю, зрабіла беларускую мову жывою, прастою і масам дастутпную. Гэта іх дапякло, мае браточкі, ды так дапякло, што месца сабе не знаходзяць і лаюцца, як цапныя...

ВОКА.



З выхадам „АСВЫ“ хадэкі распачалі траулю супроць яе і людзей працуючых у ей.

На ланцугох барзыя брэшуць,
З „АСВОЙ“ героі нашы чэшуць,
Дзе гістарычнай праўды цень
Лягла на іх хадэцкі дзень.

У—цю, у—га а Кусі трымай,
Не нашай людзі косьці, крові;
Барзыя поднялі тут лай
На хадэцкай, ўласнай мове.

„Прадажнікі!!! саветафілы!..“
Заплыўшы тлушчам, — крычаць рылы,
Барзыя пеняцца і брэшуць,
Сыны працоўных на перад чэшуць.

Люты.

Гэй браточкі!

Гэй браточкі, ня сумуйце,
Бач ізноў „Асва“ ляціць,
Адчыняйце шырэй хату,
Яна ўсіх развесяліць.
Сабірайцеся наўкола
Адзін стане хай чытаць,
А ўсе слухайце уважна
Каго будзе там кусаць.
Потым хлопцы прачытаўшы
Прывітаньне ёй паслаць
Ды сабраўшы на пяць грошай
„АСВЫ“ фонд узмацаваць
Во „АСВЫ“ браткі ня любіць
Хто з працоўных смокча пот,
Яе мусіць падтрымаці
Наш працоўны харавод.

М. Д.
(Смургонь).

Дагадлівы.

Сабраліся сяляне і абгаварываюць свае злыбяды.

— Ты пытаешся чым я буду, калі выплаціць з мяне ўсе падаткі?!

— Ты будзеш тады чыстакроўным жабраком, адказвае за яго другі.

К нам у шэрэгі!

Ты чаго, Панас, стаіш?
Рот разьзявіўшы глядзіш,
Як рыдлёўкамі капаем
Дзірваны, адлог ўспухляем;
Зярнё кідаем у ролю,
Каб пажаці шчасьця волю.
Засукай, брат, рукавы,
Давай разам, дзірваны
Будзем рваць, рубаць і сечы,
Каб лягчэй жылось на сьвеце,
Каб ўсю гніль ўзарваць да грунта,—
Мы-ж сыны зары і бунта!..
Дык чаго, Панас стаіш,
Ні то едзеш, ні то сьпіш,
Узварухні брат галавою,
Ды паходкаю стальною
К нам ў шэрэгі, на дзірван —
Узмацняй працоўны стан.

Бадзёры.

З падваротні...

З падваротні чуцен сык,
Усіх кірункаў панскіх клік:
Пан Астроўскі і Лучкевіч,
Янка кс Адам Станкевіч
„Працы“, Золкі“ і „Шляхі“;
Пішуць розныя страхі.

Аб рэформе правапісу,
Гоман ўзьнялі дзікі,
Гроцы ёсць па коштарысу,
Даў іх пан... вялікі.

І крычаць із падваротні —
Надрываюць грудзі;
— „Беларус народ самотны
Выйдзе хутка ў людзі“.

Рэзалюцыі й пратэсты
Смаляць ў габінетах,
Робяць мучаньнікаў гэсты
У сваіх панскіх мэтах.

Ой не зьбіць вам з панталыку —
Сыноў варштата, плуга!
Не паверацць яны крыку —
Ворага, не друга.

ЮАНЬ-КАРАНЬ.

У скарбовым бюро.

Ужэнднік да селяніна.— Колькі-ж вы маеце даходу?

Селянін. — Да ходу? Да ходу маю, панок, дзьве нагі, ды і ты дрэнныя

Драбностка.

— Дзядзька Андрэй,хто гэта ў вас так галасна крычаў?

— Драбностка гэта цётка Аўдоця паказвала дарогу сэквэстратару.

Авадзень.

Выпісывайце „АСВУ“

Рэдактар - выдавец: П. РАДЗЮК
Druk. Sp. Wytw. Handlowa, Trocka 7.